# НЯХАЙ ЖЫВЕ 1 МАЯ!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі універсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 14 (445) Панядзелак, 1 мая 1961 г. Цана 1 кап.

## НАШ ПЕРШАМАЙ

Вясна ўладна ўступіла ў свае правы. Зазелянелі дрэвы, і блакітнае-блакітнае неба павісла над разбуджанай зямлёй. Прышоў радасны Першамай—свята шчасця, вясны і міру.

Так ужо павялося на нашай зямлі, што ў перадсвяточныя дні рабочыя і калгаснікі рапартуюць партыі аб датэрміновым выкананні вытворчых заданняў. У строй уступаюць новыя домны і шахты, пракладваецца першая баразна на тысячах гектараў новых зямель. Але самай радаснай падзеяй перадсвяточных дзён быў бяспрыкладны палёт у космас карабля-спадарожніка «Усход» з чалавекам на борце. Той памятны веснавы дзень стаў першым днём новай эры ў гісторыі чалавецтва—эры касмічных падарожжаў.

Новымі поспехамі сустракае Першамай і калектыў нашага ўніверсітэта, які будзе адзначаць у кастрычніку гэтага года сваё слаўнае саракагоддзе. Многія сотні ўчарашніх рабочых і калгаснікаў паспяхова штурмуюць вяршыні навукі, упэўнена ідуць да сваёй мэты. Сёння ў святочнай калоне разам з табой пойдуць выдатнікі вучобы, гордасць нашага ўніверсітэта—Ала Барташэвіч, Віктар Кавалькоў, Зенон Наркевіч і многія, многія іншыя. Гэта нашы студэнцкія маякі, на іх мы павінны раўняцца.

У перадмайскія дні глыбокае хваляванне перажывалі нашы выпускнікі—у іх жа ішло размеркаванне. А колькі радасных трывог нясе з сабой гэтае простае слова—размеркаванне! Ужо ведаюць месцы сваёй будучай работы фізікі і матэматыкі, філолагі і гісторыкі.

Жадаем вам, дарагія сябры, самых найлепшых поспехаў у рабоце.

А ў тых, перад якім не стаіць вострая праблема выбару месца сваёй будучай дзейнасці, на парадку дня веснавая экзаменацыйная сесія. Для некаторых яна ўжо наступіла. Ужо здалі першыя залікі журналісты чацвёртага курса і іх аднакурснікі—географы. У іх жа ўперадзе больш як па два месяцы практыкі.

Як бачыце, май нясе нам шмат цікавага і хвалюючага. Нездарма ж у першы дзень гэтага месяца мы ўрачыста адзначаем 1 Мая—дзень міжнароднай салідарнасці працоўных, дзень адзінства і братэрства рабочых усіх краін.

Няхай жыве наш радасны Першамай—свята радасці, міру і дружбы!

---

Юнакі і дзяўчаты! Вучыцеся жыць і працаваць па-камуністычнаму! Выпрацоўвайце ў сабе працавітасць і дысцыпліну, высокія маральныя якасці! Будзьце вернымі прадаўжальнікамі рэвалюцыйных традыцый, свядомымі будаўнікамі камунізма!

Няхай жыве слаўная савецкая моладзь!

(З заклікаў ЦК КПСС да 1 мая 1961 г.)

---

### ДАКЛАДЫ ГАСЦЕЙ

—Слова прадастаўляецца студэнтцы Горкаўскага ўніверсітэта імя Лабачэўскага Ларысе Яблонскай,—аб'явіў прафесар М. Р. Ларчанка.

Даклад Яблонскай «Крытыка станоўчага вобраза ў рамане Тэндракова «За бягучым днём» быў праслухан удзельнікамі навуковай канферэнцыі СНТ з вялікай цікавасцю.

—Самае каштоўнае ў дакладзе тое,—сказаў загадчык кафедры замежнай літаратуры Д. Я. Фактаровіч,—што аўтар выказвае ў дакладзе свае асабістыя крытычныя заўвагі.

Цікавым быў даклад «Прыгожае ў разуменні Чэхава», які прачытала студэнтка чацвёртага курса Адэскага ўніверсітэта Таня Барская.

Студэнтка Вільнюскага ўніверсітэта імя Капсукаса Н. Латыніс выступіла з дакладам «Чэхаў і Мапасан».

### ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ

У перадсвяточныя дні праводзіўся агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці факультэтаў, прысвечаны 1 Мая. Свае майстэрства паказалі географы, фізікі, хімікі, гісторыкі, матэматыкі і філолагі.

Студэнты фізічнага факультэта паказалі на аглядзе спектакль на студэнцкую тэму, які яны напісалі самі. Добра выступілі эстрадныя аркестры фізічнага і матэматычнага факультэтаў, а таксама вакалісты геаграфічнага і гістарычнага факультэтаў.

Няма сумнення ў тым, што пасля заканчэння агляду наша агульнаўніверсітэцкая самадзейнасць прыме ў свае рады новых удзельнікаў.

**Л. СУШКЕВІЧ,**
член бюро камітэта камсамола.

---

## У добры час, Ніна!



Паглядзіце, як шчыра ўсміхаецца гэта дзяўчына. Значыць, радасна ў чалавека на душы. Выпускніца гістарычнага факультэта Ніна Бандарэнка днямі атрымала накіраванне на работу ў Смалявіцкі раён. Там яе чакае цікавае, кіпучае жыццё. Поспехаў табе, Ніна!

## Правільным курсам

НАРЫС

*Лета адцвітала рознакаляровымі праскамі. І як заўсёды бывае ў гэтую пару, універсітэцкі сквер быў, бадай, самым людным месцам у горадзе. Тут хадзілі групамі, па двое, спрачаліся, дзяліліся ўражаннямі, радаваліся поспехам, хваляваліся з-за няўдач. Сярод віхрастых рухавых дзесяцікласнікаў можна было ўбачыць малайцаватых, абветраных марскімі шквaламі матросаў і апаленых гарачым сонцам поўдня пагранічнікаў.*

*Былыя воіны рыхтаваліся стаць студэнтамі. Ішлі прыёмныя экзамены ва ўніверсітэт.*

*Універсітэт! Колькі светлых мар і надзей звязана з гэтым словам! Колькі цудоўных хваляванняў, трывог і радасцей чакае цябе тут, калі кожны дзень запоўнены жыццерадаснай, кіпучай мітуснёй, калі кожны час прыносіць нешта новае, невядомае!*

*58 аўдыторыя. Сёння яна перапоўнена. Стаіць урачыстая цішыня. Учарашнія дзесяцікласнікі, воіны, калгаснікі і рабочыя пішуць сачыненне па рускай мове. Ціха шалясцяць лісткі паперы, задуменныя твары будучых студэнтаў.*

*За першым сталом сядзяць двое. Коратка стрыжаныя валасы, мужны твар, на грудзях знак выдатніка. Злева на стале неразлучная «беска». Побач з матросам хударлявы хлапчук, гадоў семнаццаці, з яснымі васільковымі вачыма і невялікай чупрынкай ільняных валасоў. Абодва схіліліся над сталом: якую тэму выбраць? Шаўчэнка палажыў бліжэй да сябе праштампаваны ліст паперы і дужыя, грубаватыя пальцы акуратна вывелі назву сачынення: «Чаму я хачу стаць юрыстам?», а крышку ніжэй—імя і прозвішча: І. Шаўчэнка. Былы марак уздыхнуў, паглядзеў на напісанае яшчэ і задумаўся. «Чаму я хачу стаць юрыстам?...» Гэтае «чаму» ужо абдумана даўно і рашэнне праверана часам, застаецца толькі запісаць яго вось на гэтыя лісты. Але ён не спяшаецца, часу хопіць, трэба напісаць усё, каб экзаменацыйная камісія паверыла ў яго жаданне. Радок за радком кладуцца на паперу думкі.*

*Не сядзіцца на крэсле суседу, ён заглядвае пад стол, лазіць па кішэнях.*

*—Слухай, марак, дапамажы,—чуецца яго ціхі шэпт.—У мяне «Вобраз Нілаўны з рамана Горкага «Маці». Падкажы, што ты ведаеш аб ёй... Ну,... чаго ты так глядзіш?*

*Часцей забілася сэрца пад фланелеўкай, непрыемнае пачуццё заказытала ў грудзях Івана, але ён маўчаў. Яго прасілі аб дапамозе, і ўпершыню ён не мог, не меў права дапамагчы.*

*—Эх, ты, а яшчэ марак,—шапталі амаль дзіцячыя вусны.*

*«А яшчэ марак»—гарачая крыўда абпаліла сэрца. Быў бы побач Толя Якаўлюк, той не сказаў бы гэткага. І камандзір карабля таксама не сказаў бы, адзін матрос з экіпажу не сказаў бы гэтых балючых слоў. Аўтаручка спынілася на паўслове. Усмаміны абарвалі думку.*

*Восень. Халоднае Чорнае мора. Карабель, прыстроіўшыся ў фарватар атрада караблёў, заходзіў у чарговую вучэбную атаку. Уся каманда на сваіх месцах. Сыры норд-ост рваў кароткія матроскія шынялі. Малады матрос Якаўлюк паслізнуўся на мокрай палубе і...*

*—Чалавек за бортам!—пачуўся моцны голас з кармы карабля. Усе, хто знаходзіўся ў гэты час на палубе, на хвіліну разгубіліся, нібы асэнсоўваючы, што здарылася. А карабель, тым часам, рассякаў хвалі «самым поўным ходам».*

*Для разважанняў не было часу. Старшыня другой стацці Шаўчэнка не паспеў нават скінуць шыняля, так і кінуўся ў поўнай форме за борт ратаваць маладога матроса. Мокры шынель цягнуў уніз, звязваў рухі. Толькі тут зразумеў Іван, што кепска зрабіў, не зняўшы яго. Моцна б'ецца сэрца, цяжка дыхаць. Але вось яшчэ дзесяць... пяць метраў. І ён паспеў своечасова. Мастрос ужо шмат нахлябаўся салёнай вады, апошнія сілы пакідалі яго. Стаміўся і Іван, напружваючы ўсе сілы. Ён трымаў абяссіленае це-*

(Заканчэнне на 2 стар.).

# ПРАВІЛЬНЫМ КУРСАМ

(Пачатак на 1 стар.).

*ла матроса, а да іх, дружна ўзмахваючы вёсламі, спяшаліся на выручку сябры.*

*Асабовы састаў карабля застыў па камандзе «смірна». Старшы афіцэр чытаў загад камандзіра карабля.*

*—За выдатныя дзеянні ў час вучэбных занятказ і адвагу, праяўленую пры выратаванні матроса Якаўлюка старшыні другой стацці Шаўчэнку аб'явіць падзяку і прадаставіць кароткатэрміновы адпачынак з выяздам на радзіму.*

*—Служу Савецкаму Саюзу!—пачуўся ўсхваляваны голас на правым флангзе шарэнгі. А непадалёку усмешкай асвяціўся твар маладога матроса Якаўлюка.*

*...Не, яны не асудзілі б яго за адказ дапамагчы гэтаму яснавокаму юнаку. Гэты было б не прынцыпова, не па-сяброўску. Хіба ж даравалі б яму, Івану Шаўчэнку, грузчыкі брыгады, брыгадзірам якой ён быў да службы на флоце, калі б ён паступіў вучыцца вось гэтак, несумленным шляхам у 1953 годзе? Вядома, не. «Вось і ты зразумееш усё гэта, можа пасля, але абавязкова зразумееш, салажонак»,—без злосці ўжо падумаў пра свайго суседа Іван і працягваў пісаць недаконччаны радок.*

*Праляцела трывожная пара ўступных экзаменаў. Радасці няма граніц, калі знаходзіш сваё прозвішча ў спісу прынятых ва ўніверсітэт. Дык вось дзе ты прышвартаваўся, старшына першай стацці Іван Шаўчэнка! Кідай якар у новым порце свайго жыцця! Твая мара збылася.*

*Студэнцкі калектыў хутка збліжае людзей. Не мог Іван жыць без сяброў. У групе вясёлыя, кемлівыя хлопцы. Яны ўмеюць цаніць чалавека. Прамы, адкрыты характар, праўдзівасць, чуласць, уменне трымаць слова—каму не падабаюцца гэтыя рысы? Усё гэта спалучалася ў Шаўчэнкі і выдзяляла яго сярод аднакурснікаў.*

*Хутка бяжыць час за справай. Зімовая экзаменацыйная сесія абнаўляе «Заліковую кніжку» Івана толькі выдатнымі адзнакамі. Старанныя заняткі, самастойная праца замацоўваюць званне выдатніка ў летнюю сесію. Іван Шаўчэнка становіцца Сталінскім стыпендыятам, а партрэт яго красуецца на Дошцы Гонару ўніверсітэта...*

*—Давай, Ваня, што-небудзь цаліннае,—студэнтка філалагічнага факультэта Ала Шульга паправіла свае локаны ў чаканні акордаў гітары. Ваня Шаўчэнка тут, у кругу студэнтаў. Прыемна гучыць матроская гітара ў яго руках.*

*Вьётся дорога длинная,*
*Здравствуй, земля целинная,*
*Здравствуй, простор широкий,*
*Весну и молодость встречай*
*свою!—*

*сплятаюцца маладыя галасы.*

*Адна песня змяняе другую. Клічуць, хвалююць простыя задушэўныя мелодыі. У шматгалосы студэнцкі хор уліваецца і мяккі барытон Вані Шаўчэнкі. А цягнік імчыць, спяшаецца. Стэпы, палі, пералескі, сівы Урал—маладыя сэрцы поўняцца гордасцю за родную Айчыну. Колькі захапляючага ў гэтых жывых пейзажах! Песні... песні...*

*У цяжкай працы прайшлі тры месяцы барацьбы за тысячы тон першагатунковага хлеба. Апусцелі цалінныя прасторы, на якіх нядаўна залатым морам шумела пшаніца. А разлучацца з імі не хочацца.*

*—Шкада цябе адпускаць, Іван, добрым ты памочнікам брыгадзіра быў,—казаў на развітанне дырэктар саўгаса «Цаліннны» Іван Міхайлавіч Шчыглаваты.—Ды і сябры твае далі клас у рабоце. Прыязджайце да нас працаваць пасля вучобы. Тут ёсць дзе разгвярнуцца.*

*Вясёлымі, узмужнелымі вярталіся студэнты на вучобу. Какчатаўскі абком камсамола ўзнагародзіў многіх юнакоў і дзяўчат Граматамі, каштоўнымі падарункамі. Зялёнай эмаллю заззяў значок «За асваенне цалінных і аблогных зямель» на выгарэўшай пад казахстанскім сонцам форменцы Івана Шаўчэнкі.*

*Саскучылі студэнты без кніжак. Зноў лекцыі, напружанная вучоба. Цяжка ўсюды паспець, але камуніст Шаўчэнка ведае: трэба—значыць можна.*

*Ён добра ведае, што кожная прачытаная старонка кнігі, кожная выдатная адзнака набліжае яго да запаветнай мары.*

*Ужо далёка за поўнач. Салодкім сном спяць таварышы па пакою. Не спіцца толькі Івану. Перад ім раскрытая кніга Гальвецыя «Аб чалавеку».*

*—Спаў бы ты, кодэкс,—уздыхае фізік Мікалай Нараленка,—людзі ноч разбяруць, а ты ўсё чытаеш.*

* * *

*Мінуць тыдні, месяцы. Пройдуць непаўторныя студэнцкія гады, і юрыст Іван Шаўчэнка пойдзе ў жыццё сваім шляхам. У добры час, дарагі таварыш, ты ідзеш сваім правільным курсам!*

**Анатоль ФУРЫК**



Фотаэцюд Л. Кузьміцкага
**БЯРОЗАВЫ СОК.**



**Вечарамі хораша марыць, успамінаць хоць сабе і не далёкае мінулае. А гэтыя дзяўчаты з трэцяга курса філфака часта збіраюцца разам, каб пагутарыць, падзяліцца дзявочымі сакрэтамі.**

**НА ЗДЫМКУ: Лена Рокач паказвае сяброўкам свой альбом.**

*Пісьмо ў рэдакцыю*

## ЯК З ГУСАКА ВАДА

Задоўга да фіналу лёгкаатлетычнага кросу ў корпусе гуманітарных навук з'явілася аб'ява. Кожнаму курсу трэба было абараняць спартыўны гонар свайго аддзялення. Здавалася, не будзе людзей, раўнадушных да гэтага мерапрыемства.

І вось настаў доўгачаканы дзень. У прывакзальным скверы сабраліся ўдзельнікі кросу. Але іх было да крыўднага мала. Для некаторых студэнтаў адлегласць у 1.000 і 3.000 метраў здалася непераадольнай. Яны, відаць, спужаліся, што ногі балець будуць.

Не з'явіліся на крос Белавус, Бяржынскі, Міцкевіч, Дабрыян з 2 курса, Іваноўская, Саматыя, Сіляўка (ІІІ курс) і студэнткі чацвёртага курса Барысевіч і Бібікава.

У выніку філалагічны факультэт атрымаў вялікую колькасць штрафных ачкоў і аказаўся на апошнім месцы. Так «пастаялі» за гонар свайго факультэта названыя вышэй студэнты. І заўсёды несумленныя студэнты, як гавораць, выходзяць сухімі з вады. Які ж вывад?

**А. КРУЦЬКО**
**А. АНІСІМАЎ.**

# Насустрач 40-годдзю ўніверсітэта

## УНІВЕРСІТЭЦКІ ВЫЛІЧАЛЬНЫ

Знешне гэтыя дзверы нічым непрыкметны. Але за гэтымі дзверамі схавана быццам часцінка будучага свету, у якім чалавек будзе гаспадаром складанейшых разумных машын.

Вялікі светлы пакой. Амаль усю плошчу займае доўгі металічны корпус электронна-вылічальнай машыны «Урал-1». Па шматлікіх вочках-лямпачках прабягаюць каляровыя аганькі. Яны то ўспыхваюць, то тухнуць. За пультам кіравання — гаспадары гэтага свету электронікі, у большасці—выпускнікі нашага ўніверсітэта. Уважліваназіраюць яны за паказаннямі прыбораў, многія з якіх манціраваліся іх рукамі. Вось адзін з работнікаў падняўся і прыадкрыў маленькія дзверцы, дзе выявілася незразумелае перапляценне шматлікіх рознакаляровых правадкоў. Трошкі пакорпаўся ў іх, зноў закрыў дзверы. Машына хітравата падмаргнула яму жаўтаватым вочкам, і з яе электронных недраў пачулася нейкае таямнічае, крышку прыглушанае гудзенне.

Так выглядае вылічальны цэнтр універсітэта. У рэспубліцы ў яго ёсць толькі адзін сабрат—у інстытуце матэматыкі і вылічальнай тэхнікі Акадэміі Навук БССР

Вялікай і рознабаковай працай заняты вылічальнікі. Асноўныя разлікі вядуцца на «Урале-1», а больш простыя — на настольных вылічальных машынах.

Цэнтр атрымлівае дзесяткі заказаў ад заводаў, прадпрыемстваў і ВНУ рэспублікі. Толькі дзесяць гадзін працаваў «Урал-1» над заказам завода імя Кірава—разлікам на жосткасць станіны гарызантальна-працяжнага станка. 70 гадзін было патрэбна электронна-вылічальнай машыне, каб правесці для радыёзавода складаны разлік.

Паслугамі вылічальнага цэнтра карыстаюцца кафедры матэматычнага, фізічнага, хімічнага і іншых факультэтаў універсітэта. Тут выконваюцца заказы многіх кафедр палітэхнічнага інстытута, многіх упраўленняў саўнаргаса БССР, навукова-даследчых інстытутаў Акадэміі Навук.

Тут праходзяць практыку студэнты 4—5 курсаў вылічальнага аддзялення матфака. Практыканты з цікаўнасцю вывучаюць машыны, набываюць навыкі работы на іх. Часта да іх прыязджаюць калегі-студэнты Магілёўскага педагагічнага інстытута.

Да позняй ночы сядзяць у вылічальным цэнтры пяцікурснікі, для якіх ужо мінуў час першага знаёмства з гэтай цудоўнай машынай. Тут рыхтуюць дыпломныя работы студэнткі Іваннікава, Пісарчык, Басякова. Стандартныя праграмы, распрацаваныя выпускнікамі для вылічальных машын, будуць выкарыстаны ў практычных мэтах.

У вылічальнага цэнтра вялікае будучае. К канцу сямігодкі з'явяцца новыя машыны, яшчэ больш магутныя.

**О. БАЛАШ.**

# СТАРТУЕ СПАРТЫЎНЫ СЕЗОН

У мінулую нядзелю над стадыёнам інстытута фізкультуры палыхалі блакітна-белыя сцягі з гордым буравеснікам—эмблемай студэнцкага спартыўнага таварыства. Памерацца сіламі ў спаборніцтвах на прыз адкрыцця летняга спартыўнага сезона сюды сабраліся мацнейшыя спартсмены ВНУ горада.

Універсітэт прадставіў каманды па лёгкай атлетыцы, валейболу, веласпорту. З вялікай перамогай трэба павіншаваць нашых лёгкаатлетаў—яны, набраўшы 11.122 ачкі, занялі першае месца, апярэдзіўшы на 200 ачкоў традыцыйных пераможцаў гэтых спаборніцтваў—каманду інстытута фізічнай культуры. У лік прызёраў заўсёды ўваходзілі спартсмены палітэхнічнага інстытута. На гэты раз яны былі толькі пятымі.

Некаторыя нашы лёгкаатлеты паказалі высокія асабістыя вынікі. Першаразраднік А. Кузнечык першым парваў фінішную лентачку ў бегу на 1.500 м. Студэнтка чацвёртага курса філфака Марыя Верамейчык штурхнула ядро на 13,39 метра. Гэта ўсяго толькі на 11 сантыметраў ніжэй нарматыву першага разрада.

Студэнт юрфака В. Князюк выйшаў на другое месца ў бегу на 400 метраў, прадстаўніца матфака М. Цяжкевіч—у бегу на 200 м.

Трэція месцы занялі таксама студэнты другога курса філфака Н. Гаўрычэнка і матэматык Вячаслаў Шалыгін. Першы—у бегу на 1500 метраў, другі—у штурханні ядра.

Паспяхова пачалі сезон валейбалісткі. У фінале яны сустрэліся з камандай педінстытута. Першую партыю нашы дзяўчаты прайгралі. Аднак ім удалося вырваць перамогу ў другой. Выключна дружна і самаадданна дзейнічала каманда ў трэцяй партыі. Добра гуляла капітан каманды Нікіціна. Гульня за намі—2:1!

У пачатку спаборніцтваў валейбалісты ўніверсітэта сустрэліся з камандай інстытута фізкультуры. Нашы рабяты пацярпелі паражэнне і выбылі са спаборніцтваў.

Па футболу спартыўны гонар універсітэта абаранялі дзве каманды. Першая дайшла да фінала, дзе ва ўпартай барацьбе ўступіла перамогу футбалістам інстытута фізкультуры. Лік мінімальны—0:1

Трэцяе каманднае месца занялі нашы веласіпедысты, прапусціўшы наперад ІФК і БПІ.

Спаборніцтвы на прыз адкрыцця сезона паказалі, што нашы спартсмены ўжо сумелі набыць добрую спартыўную форму. У далейшым ад іх можна чакаць высокіх вынікаў.

**О. ЛІЛІНА.**

## ПІЯНЕРСКАЕ ДЗЯКУЙ

*З нецярпеннем мы чакалі таго дня, калі ўбачым сваю сталіцу. І вось 16 красавіка мы прыехалі ў Мінск. Нам вельмі спадабаўся горад і яго людзі. Усюды, дзе б мы ні бывалі, нас ветліва і цёпла сустракалі. Наведалі мы і заалагічны музей БДУ імя У. І. Леніна. Гэта вельмі багаты і цікавы музей. Мы доўга разглядалі яго разнастайныя экспанаты.*

*Загадчык музея Барыс Захаравіч Галадушка і лабарант-рэстаўратар Антон Канстанцінавіч Ціток шмат цікавага расказалі нам аб экспанатах музея, аб яго стварэнні і аб сваёй рабоце. Піянерскае Вам дзякуй, Антон Канстанцінавіч і Барыс Захаравіч! Мы вельмі задаволены наведваннем музея, бо ўбачылі тут шмат цікавага, аб чым толькі чыталі ў кніжках.*

По даручэнню групы экскурсантаў Валя КАРСЮК, Міша МІСЕВІЧ, піянеры Браткаўскай 8-гадовай школы Капыльскага раёна.

Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

НАШ АДРАС:
Мінск,
Універсітэцкі гарадок,
біякорпус, 31.
Тэлефон: 2-07-19.
Друкарня выдавецтва
БДУ імя У. І. Леніна.

АТ 04334 Зак. 1106.